## Прафілактычная акцыя “Пакаленне, якое не курыць:

## мы за жыццё без тытуню!”

**15 лістапада**, у **Міжнародны дзень адмовы ад курэння**, ва УА “Ашмянскі дзяржаўны прафесійны аграрна-тэхнічны каледж” прайшла акцыя **“Пакаленне, якое не курыць: мы за жыццё без тытуню!”**. Спецыялісты аддзялення сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі і валанцёры атрада «Ветразь Надзеі» прапанавалі навучэнцам каледжа зрабіць выбар “Курыць або не курыць?”. Тыя навучэнцы, якія вырашылі адмовіцца ад курэння, паставілі свой подпіс на павялічанай мадэлі цыгарэты, а тыя, хто яшчэ не гатовы зрабіць такі крок, атрымалі буклеты “Мы за жыцце без тытуню!”, “Дзяўчаты супраць курэння дзяўчат!” з інфармацыяй аб наступствах спажывання тытуню і матывацыі на здаровы лад жыцця.